УДК37.017.4:502:821.161.3

Г.Ф. Швед

# ЭКАЛАГІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ПРАЗ ТВОРЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Вечная ў мастацкай творчасці тэма прыроды, адносін чалавека да яе набыла асаблівую актуальнасць у наш час, калі супярэчнасці паміж грамадствам і навакольным асяроддзем надзвычай абвастрыліся. У апошні час праблемы экалогіі набываюць глабальны характар. Сённяшні стан прыроды выклікае вялікую трывогу ва ўсім свеце. Захаванне прыроднага асяроддзя – найвасрэйшае сацыяльнае пытанне, вырашэнне якога патрабуе агульных намаганняў усяго чалавецтва. Застаючыся цэнтральнай у літаратуры, праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды ўзбагацілася ў апошні час новымі аспектамі, звязанымі з неабходнасцю мастацкага даследвання сацыяльна-маральных асноў чалавечага жыцця. Тэма ўзаемаадносін чалавека і прыроды ў літаратуры нашых дзён загучала па-грамадзянску абвострана, з драматычнай напружанасцю або рамантычнай прыўзнятасцю, раскрываецца яна ў перапляценні з найважнейшымі сацыяльнымі і маральна-этычнымі праблемамі эпохі. Узаемаадносіны сучаснага чалавека з прыродай ускладніліся, ускладніўся і сам духоўны свет чалавека нашага грамадства. Узброены найноўшымі навуковымі дадзенымі пра заканамернасці многіх прыродных з’яў, ён адчувае больш глыбокую, чым проста ўтылітарную, сувязь з прыродай. Раскрыць сутнасць гэтых новых узаемаадносін чалавека і прыроды ва усей іх паўнаце, адлюстраваць самыя тонкія рухі душы і сэрца сучаснага героя, асэнсаваць свет яго думак і імкненняў – няпростая задача нашай літаратуры.

Тэма “чалавек і прырода” шырока прадстаўлены ў сучаснай беларускай літаратуры ва ўсіх яе жанрах. Да яе ўсе больш звяртаюцца публіцысты, літаратурныя крытыкі, тэарэтыкі і гісторыкі літаратуры, якія, абагульняючы мастацкі вопыт класічнай сусветнай, раскрываюць вялікую сацыяльна-філасофскую каштоўнасць гэтага вопыту для асэнсавання праблем экалогіі ў жыцці сённяшняга чалавека. У мастацкай літаратуры вылучылася так званая літаратурная экалагічная плынь, у цэнтры яе – творы І. Пташнікава, В. Карамазава, В. Казько, А. Жука, М. Стральцова, А. Кудраўца і інш.